■ Віцебская школа

# ЯКІМ БЫЎ DOS?

## Успаміны з творчай суполкі «Квадрат»



Адна з апошніх сустрэч Аляксандра ДАСУЖАВА *(злева)* і Мікалая ДУНДЗІНА.

**Сёлета спаўняецца 95 гадоў створанаму Казімірам Малевічам УНОВІСу. Умацавальнікам Новага Мастацтва (Утвердителям Нового Искусства, ад чаго і назва), што, адмятаючы рэалізм, здзіўлялі сучаснікаў у паслярэвалюцыйныя гады сваімі творчымі эксперыментамі. Віцебскае нефармальнае творчае аб'яднанне «Квадрат», арганізаванае ў сярэдзіне 1980-х гадоў, працягвала традыцыі першых авангардыстаў. Адным з яго аўтараў быў стваральнік канцэпцыі ПЛІП Аляксандр ДАСУЖАЎ, ці проста — DOS. Першыя літарамі свайго прозвішча ён падпісваў палотны, так часам да яго звярталіся сябры... Летась Аляксандр Ігаравіч пайшоў з жыцця, а сёлета — 31 кастрычніка — яму споўнілася б 70 гадоў. Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з сябрам Аляксандра Дасужава, вядомым мастаком, уладальнікам папулярнага віцебскага салона-галерэі «Сцяна» Мікалаем ДУНДЗІНЫМ.**

### «А МНЕ ТАК ЗАХАЦЕЛАСЯ»

У Віцебску Аляксандр Дасужаў, ураджэнец вёскі Пухавічы Мінскай вобласці, як цяпер бы сказалі, быў крэатыўным студэнтам.

— Саша быў на пяць гадоў старэйшы за мяне. Я паступіў на мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута (сёння гэта дзяржаўны ўніверсітэт. — **Аўт.**) у 1968 годзе, а ён у гэты час ужо працаваў над дыпломам. У адрозненне ад мяне Саша з аднакурснікамі ўжо цвёрда стаялі на нагах, мелі за плячыма службу ў арміі. Я быў, лічыце, «пацаном», а яны — мужчынамі, з жыццёвым вопытам і прынцыпамі, — распавядае Мікалай Мікалаевіч. — У «мастграфе» сярод іншых выкладалі малады Гумен (мэтр акварэлі, які і цяпер поўны сіл), графік Клікушын (аўтар шрыфтоў), у будучыні «гуру» дзясяткаў віцебскіх акварэлістаў Сталяроў... Курс кожнага з іх і наогул факультэт былі моцнай школай. Разам з тым студэнты самастойна вывучалі класічнае мастацтва, адкрывалі для сябе Пікаса, Далі, ды і Шагала. Я, дарэчы, не ведаў, хто такі Шагал. Рэцэнзент, калі ўбачыў мой дыпломны твор «Сузор'е знакаў Задыяка», запытаўся: «А вы выпадкова не яўрэй? Вельмі падобна да Шагала...» А я: «А хто ён такі?» Саша, упэўнены, ведаў, і не толькі Шагала. Ён даставаў замежныя часопісы пра мастацтва, любіў фільмы Таркоўскага і Феліні, цытаваў вершы нейкага грэка... Яшчэ студэнтам ён пачаў выпрацоўваць аўтарскі стыль і дарослым эксперыментаваў, шукаў «разыначку» нават у нацюрмортах. На адной выставе вядомыя майстры традыцыйнай школы пахвалілі яго пейзаж. «Але чаму ў небе лётае хустка ці што там?» — запыталіся. Ён патлумачыў, што хацеў надаць нейкае адчуванне палёту. «Дык напісаў бы воблака!» — кажуць. Саша ў адказ: «А мне так захацелася!»

### 3 МАГІЛЫ ВЫСОЦКАГА — СА СТОМЛЕНЫМІ ВАЧЫМА...

— Творчы саюз існаваў і да афіцыйнага стварэння «Квадрата». У склепе аднаго дома знаходзілася некалькі майстэрняў — Аляксандра, будучага лідара «Квадрата» Малея, скульптара Слепава і мая. Да нас у госці заходзілі знаёмыя мастакі. Зразумела, і выпівалі, напрыклад, у Сашы збіраліся на французскі абед: на стале батон і французскае віно. Мерапрыемства плаўна перацякала ў вячэру, падчас якой мы вялі класныя размовы, спрачаліся, чыталі вершы і пісалі. У гэтыя моманты нараджалася шмат крэатыўных ідэй... У нас тады было ўзаемнае пачуццё любові, дружбы, адданасці. Гэта і перарасло ў «Квадрат», — не прафесійны саюз, а, хутчэй, духоўнае братэрства. Тут усё было грунтоўна, акрамя гадавога плана выставачнай дзейнасці. Ён для кожнага быў індывідуальны. Кантралявалі адзін аднаго, каб некаторыя раптам «не загулялі». Раслі творча... «Квадрат» праіснаваў сем гадоў — гэта даволі шмат. Аналагі з'яўляліся і самараспускаліся, а «Квадрат» жыў, — успамінае Мікалай Дундзін.



Палатно Аляксандра ДАСУЖАВА ПЛІП 45 «Дарога да зімы».

Сам Мікалай быў адказным сакратаром суполкі. З гумарам успамінае, што самым цяжкім было... збіраць узносы, па 10 рублёў у месяц у «агульную касу». Для параўнання: квіток у кіно каштаваў 25 капеек. «Казну» трацілі на сумесныя праекты, друк плакатаў і анонсаў выстаў, паездкі ў Піцер, Маскву, Каўнас...

— У Піцеры пазнаёміліся з удавой і дачкой Казіміра Малевіча — Наталляй Андрэеўнай і Уна-Ганнай. Першая незадоўга да сваёй смерці прыслала нам тэлеграму, дзе віншавала з выставай, прысвечанай 110-гадоваму юбілею з дня нараджэння Малевіча. Дзякуючы гэтаму знаёмству ў Віцебску стала больш інфармацыі пра часы УНОВІСа. І з «Міцькамі» (група творчых людзей, у першую чаргу мастакоў. — **Аўт.**) пасябравалі, як і з многімі цяпер вядомымі кампазітарамі, паэтамі. У Маскве было не менш цікава. Неяк на пачатку вячэры Аляксандр знік. Раніцай вяртаецца са стомленымі вачыма, «шэрым» тварам і кажа, што ўвесь час быў... ля магілы Высоцкага.

### ТАКІ СУРАЗМОЎЦА — ЗНАХОДКА

— DOS умеў сябраваць. Камунікаваў з кампазітарамі, акцёрамі, паэтамі і далёкімі ад творчасці асобамі. Ён мог паехаць да некага ноччу, каб проста пасядзець побач. Чаго таіцца: і каб выпіць чарку, калі сябру дрэнна на душы. Аляксандр быў вельмі прыгожым унутры і знешне, разумна гаварыў і ўмеў слухаць. Такі суразмоўца — знаходка. Не дзіўна, што вельмі падабаўся жанчынам. І сам іх кахаў... Ён насіў з сабой запісную кніжачку. Тут былі не вершы, а нейкія фразы, разважанні, назіранні. Напрыклад: «Шагал шагал, шагал и до Парижа дошагал...» Рабіў запісы па тэме сваёй канцэпцыі ПЛІП. Ён доўга думаў і спыніўся на паверхні з лініяй і плоскасцю.

Блізкія Аляксандра Ігаравіча цяпер жывуць у Санкт-Пецярбургу. Сын многаму ў яго навучыўся і таксама займаецца творчасцю. Дачка — інжынер, ее сын — супрацоўнік ваенна-гістарычнага музея. Спадар Дундзін — яго хросны...

Незадоўга да смерці Аляксандр Дасужаў перамог у абласным адборы конкурсу арт-праекта «Zabor». Гэта апошняе творчае дасягненне, якіх у яго было шмат. Творы DOSa былі прадстаўлены на выставах у Германіі, Латвіі, Расіі, Польшчы, Іспаніі і іншых краінах. Палотны знаходзяцца ў многіх прыватных калекцыях і музеях. Рэпрадукцыі яго твораў увайшлі ў выданне «Беларускі авангард 1980-х».

Памёр раптоўна. Пайшоў у краму, стала дрэнна. У Мікалая Дундзіна ёсць партрэт, напісаны сябрам, ПЛІПы, фотаздымкі і запісы тэлевізійных рэпартажаў, прысвечаных «Квадрату». Сярод здымкаў — фрагменты роспісу фасада дома па эскізе Умацавальнікаў Новага Мастацтва... Аляксандр Дасужаў стаў адной з самых яскравых зорак «новага» беларускага авангарду. Як адзначыў адзін з сяброў мастака, DOS — у творчай камандзіроўцы. Адкуль вяртаецца кожны раз, калі глядзіш на яго фота і творы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■ Вернісаж

# «З ЗЯМЛІ ПАДЫМАЮ ЯБЛЫК...»



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Госці гэтага вернісажу, што прыспеў якраз да яблычнага Спасу, любаваліся крутабокімі падарункамі саду, якія, здаецца, толькі-толькі паклалі на шыкоўныя посцілкі, на стол і падаконнік, у кошык, і мастак яшчэ збіраецца перанесці іх абрысы на паперу. Але карціны ўжо віселі на сценах, а мастак прымаў віншаванні з нагоды здзяйснення сваёй мары і частаваў прысутных свежай садавіной. Так у Літаратурным музеі Максіма Багдановіча пачалася выстава акварэляў мастака Генадзя ЧЫСТАГА «З зямлі падымаю яблык...».

Чыстага добра ведаюць у краіне як таленавітага мастака-афарміцеля, дзякуючы якому з'явілія цікавыя экспазіцыі ў многіх беларускіх музеях і ў Нясвіжскім палацы Радзівілаў. Удумліва і з асаблівай любоўю працуе ён у літаратурных музеях. Міцкевіч, Чорны, Багдановіч — у Ракуцёўшчыне і расійскім Ярэслаўлі... Дзесяць музеяў і сто выстаў — такі «паслужны» спіс мастака-афарміцеля Генадзя Чыстага. А вось як майстра нацюрмортаў яго ведаюць менш, бо праз сціпласць ён не шмат выстаўляў свае светлыя, радасныя, амаль празрыстыя акварэлі. Гэтая «яблычная» выстава, вядома ж, дабавіць яму прыхільнікаў. Бо пачатак пачаткаў, любоў і спакуса, вечнасць і перасцярога, што сімвалізуе яблык, зразумелыя і блізкія кожнаму. І так будзе вечна, сцвярджае мастак гэтак жа, як паэт Кастусь Цыбульскі, радок якога і даў назву выставе: «З зямлі падымаю яблык — / Спелы румяны ранет, / Які быў пупышкай, / Стаў кветкай, / Зваліўся яблыкам... / І так мільёны гадоў».

**Лідзія ПЕРАСЫПКІНА**

■ Культпаход

# СЕЗОН МАР,

## або З чаго пачынаюць тэатры?

**Ёсць людзі, якія не стануць засмучацца блізкім заканчэннем лета: ва ўсім ёсць свае станоўчае, яго варта толькі ўбачыць. І мы ўбачылі — афішы, якія сведчаць пра пачатак сезона ў тэатрах краіны. Прычым, некаторыя не сталі чакаць восені, адчыніўшы свае дзверы ўжо ў жніўні. І ў гэтым ёсць рацыя: людзі вяртаюцца з адпачынкаў, але яшчэ апошнія летнія вечары хочуць правесці прыемна, культурна і з карысцю.**

Першыя, хто разумее культурны запыт тэатралаў, — нацыянальныя тэатры. Напрыклад, **Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Янкі Купалы** свой 95-ты сезон адкрывае 25 жніўня. Для Купалаўскага шмат гадоў — нават дзесяцігоддзяў — не было выбару, які спектакль ставіць у афішы новага сезона першым. Адноўленая «Паўлінка» Янкі Купалы была спектаклем адкрыцця тэатра пасля рамонту (яна будзе, але ўжо ў верасні). Жыццё ў родных сценах найперш вымагае ад тэатра галоўнага — дыялогу з сучасным гледачом, які прыходзіць сюды не толькі дзеля разнявольнення, але яшчэ і па адказы на некаторыя пытанні, што ўзнікі не сёння і не цяпер у жыхароў менавіта нашай краіны. Адказы — у нацыянальнай драматургіі. І не толькі купалаўскай. Напрыклад, у «Пінскай шляхце» Вінсэнта Дуніна-Марцінкевіча, пастаўленай Мікалаем Пінігіным. Хто яшчэ не паглядзеў? Самы час для гэтага спектакля, жанр якога вызначаны як фарс-вадэвіль. У сённяшняй грамадскай сітуацыі ёсць нагода паразважаць пра Беларусь і магчымасці для яе развіцця. І яшчэ пра Беларусь з гісторыяй і асобамі: на наступны дзень, 26 жніўня, — «Чорная панна Нясвіжа» паводле Аляксея Дударава ў пастаноўцы Валерыя Раеўскага. З нацыянальнай тэмы на пачатку лета яшчэ «Людзі на балоце»(спектакль Аляксандра Гарцуева паводле Івана Мележа). І вядома, што без адной з самых абмяркоўваемых прэм'ер канца мінулага сезона не абышлося: чэхаўская «Чайка» ў інтэрпрэтацыі Мікалая Пінігіна ў жніўні прылятае на Купалаўскую сцэну двойчы.

**Для Купалаўскага шмат гадоў — нават дзесяцігоддзяў — не было выбару, які спектакль ставіць у афішы новага сезона першым.**

**Нацыянальны акадэмічны рускі драматычны тэатр імя М. Горкага** таксама пачаў сезон з прэм'еры. Праўда, тут пануе сусветная класіка. Сезон адкрыў на гэтым тыдні спектакль «Кола кахання» паводле Самерсэта Моэма (пастаноўка Мадэста Абрамава). Потым пайшлі камедыі «Утаймаванне свавольніцы» паводле Шэкспіра і «Злоўлены сеткай» паводле Рэя Куні, усе пастаноўкі Валянціны Ераньковай, таксама як і «Жаніх» паводле Гогаля. Праўда, ёсць яшчэ «Ён і Яна» і «Вечнасць на дваіх» (рэжысёра Барыса Луцэнкі) і «Ідэальны муж» і «Пігмаліён» у пастаноўцы Аркадзя Каца, іншыя вядомыя назвы... І шкада, што няма сярод іх спектакля, які быў бы створаны ў гэтым нацыянальным тэатры з думкамі пра нашу краіну, якія, між іншым, былі на Горкаўскай сцэне...

Нехта скажа: «Беларуская драматургія — тэма для асобнага тэатра, які ў нас дзеля яе развіцця і прасоўвання і быў створаны». **Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі** пачынае новы сезон таксама ў жніўні. І адмысловым міжнародным праектам пад назвай «Тэатральны вяж». Ініцыятары — грамадскае аб'яднанне «Тэатра» з Беларусі і асацыяцыя «Demain Le Printemps» з Францыі: іх намаганнямі створаны адмысловы спектакль, асновай для якога сталі назіранні і замалёўкі з жыцця мінчан. Цікава ж, як нас бачаць артысты не толькі з Беларусі, але і іншых краін. Нам абяцаюць спектакль, дзе спалучаюцца драматургія, пластыка, акрабатыка, танец (27 і 28 жніўня). Але для адкрыцця ўласнага сезона ў тэатры ёсць музычная «Адвечная песня» Купалы.

У **Музычным тэатры Беларусі**, між іншым, ёсць пастаноўкі з нацыянальным аблічам. Але жнівень прапануе мюзікл папулярнага расійскага кампазітара Кіма Брэйтбурга «Блакітная камея» пра прэтэндэнтку на расійскі прастол князёўну Тараканаву і адноўлены «Бабін бунт» паводле «Данскіх апавяданняў» Міхаіла Шолахава.

**Хто яшчэ не паглядзеў? Самы час для гэтага спектакля, жанр якога вызначаны як фарс-вадэвіль. У сённяшняй грамадскай сітуацыі ёсць нагода паразважаць пра Беларусь і магчымасці для яе развіцця.**

Свае героі і свае характары ўвасоблены ў спектаклі «Несцерка» (паводле Віталя Вольскага) у **Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа**, што працуе ў Віцебску. Тэатр трымае марку: менавіта гэтым спектаклем пачнецца 90-ты сезон.

Усё ж большасць тэатраў у краіне абуджаецца па-ранейшаму ў верасні. Вось толькі **Гродзенскі абласны драматычны тэатр** у апошнія выхадныя жніўня прапануе сваім гледачам камедыі паводле Рэя Куні (надзвычай папулярны ў нас аўтар) «Надта жанаты таксіст» і «№13». У Брэсце ўжо рыхтуюцца да міжнароднага фестывалю «Белая вежа» (на пачатку верасня). Міжнародная тэма ў Гомелі будзе раскрыта праз гастролі Арлоўскага дзяржаўнага тэатра «Вольная прастора». У сталіцы ў верасні гастролі Свярдлоўскага акадэмічнага тэатра музычнай камедыі. Гэта паўнавартасныя вялікія гастролі, цягам якіх нам прадставяць 10 назваў спектакляў, у прыватнасці мюзікл Максіма Дунаеўскага «Пунсовыя ветразі» паводле Аляксандра Грына (сына беларускага шляхціца, які быў высланы і застаўся ў Расіі). Спектакль пра тое, што нават самыя дзіўныя мары пра шчасце здзяйсняюцца. А мы так любім марыць...

**Ларыса ЦІМОШЫК.** *tsimoshyk@zviazda.by*